Аляксей Шаланда
(Гродна)

# Гербы роду Сапегаў

Сярод гербаў, якія размяшчалі Сапегі, як северскай, так і кодэньскай галін роду, у сваіх складаных гербах на працягу XVI-XVIII стст., найчасцей выкарыстоўваліся тры наступныя: польскі герб Ліс, герб Тры ліліі і герб з выявай збройнай рукі прабітай стралой. Гісторыя з'яўлення іх у Сапегаў заблытаная і загадкавая. Высвятленне яе неабходнае для вырашэння дзвюх праблем: першапачатковага ўласнага герба Сапегаў і прынцыпу, якім яны кіраваліся пры складанні сваіх шматчастковых гербаў.

Польскі герб Ліс ці Бзура ўяўляе сабой у чырвоным полі белую стралу вастрыём уверх, два разу перакрыжаваную, а ў нашлемніку — ліса[1] (мал. 1). На нашай зямлі ён з'явіўся пасля Гарадзельскага сойма 1413 г., дзе да яго быў адаптаваны кашталян троцкі Сунігайла[2]. З'яўленне Ліса ў Сапегаў тлумачыцца тым, што менавіта ад гэтага Сунігайлы яны выводзілі пачаткі свайго радаводу. Для гэтага першы гістарычна вядомы прадстаўнік роду — Сямён Сапега, які ўпамінаецца ў 1440-1450 гг. як пісар вялікага князя літоўскага Казіміра Ягайлавіча[3], зліваўся з асобай троцкага кашталяна. Паводле прывілеі Жыгімонта Старога ад 1512 г., дадзенага Івану і Багдану

1 B. Paprocki, *Herby Rycerstwa polskiego,* Kraków 1858, s. 187; B. Chmielowski, *Zbiór krótki herbów polskich oraz wsławionych cnotą i naukami Polaków,* Warszawa 1763, s. 176.

2 I. Dlugossi, *Historiae Poloniae,* Libri XII, Francofurti 1711; Liber XI, s. 342.

3 J. Wolff, *Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego 1386-1795,* Kraków 1885, s. 254; W. Dworzaczek, *Genealogia,* Warszawa 1959, tabl. nr 169; В. Л. На-



Мал. 1
З кн. B. Paprocki, *Herby Rycerstwa polskiego,* Kraków 1858, s. 187.

Сямёнавічам Сапегам: „(...) Бацьку іх Сямёну Сунігалу кашталяну Троцкаму, сыну Пунігайлы Нарымунтавіча, Сафіяй празванага, таксама Троцкага каштэаляна, за знакамітыя перад ім заслугі дазволены і наданы да вольнага карыстання Яму і нашчадкам Герб, які ён сам [узяў] на Сойме Гарадзельскім пры Уніі Літоўскай, на якой з іншымі князямі крэўнымі Нашымі знаходзіўся, Герб папросту званы Ліс (...)"[4]. Б. Хмялёўскі пісаў, што нібыта імя Сямён узяў Сунігайла пры хрышчэнні[5]. На самой справе, меў ён хрышчонае імя Ян[6]. Магчыма, улічваючы гэта, Войцех Віюк -Каяловіч рабіў Сямёна Сапегу, якога ён называе ваяводам падляшскім і паслом да папы рымскага ад Казіміра Ягайлавіча, сынам Сунігайлы[7]. Але сярод сыноў кашталяна троцкага сын Сямён не вядомы[8]. Наогул, пра такога ваяводу падляшскага, акрамя сведчання В. Каяловіча, няма ніякіх больш слядоў[9]. Хутчэй за ўсё, Сунігайла-Ян і Сямён Сапега не былі звязаны нейкімі крэўнымі сувязямі, на што ўказваў і У. Сэмковіч[10]. Атаясамліванне Сямёна і Сунігайлы ў прывілеі 1512 г. яскрава сведчыць пра тое, што ён — падробка. Стварыўся ён з мэтай вывесці род Сапегаў ад Гедыміна, злучыўшы сапраўды існаваўшых князя Нарымунта і Сунігайлу, з цалкам міфічным Панігайлам Сафіяй[11].

севіч, *Генеалагічныя табліцы старадаўніх княжацкіх і магнацкіх беларускіх родаў 12-18 стагоддзяў,* Мінск 1993, с. 34.

4 K. Kognowicki, *Życia Sapiehów y Listy do monarchów, książąt i różnych panujących do tychże pisane,* Wilno 1790, t. I, s. 2, 4.

5 B. Chmielowski, dz. cyt., s. 300-301.

6 J. Wolff, dz. cyt., s. 63.

7 K. Niesiecki, *Herbarz Polski,* Lipsk 1841, t. VIII, s. 242.

8 W. Semkowicz, *O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413,* 15-001 Biaiystok, „Lituano-Slavica Posnaniensia Studia Historica", Poznań 1989, t. Ш, s. 44-45.

9 K. Kossakowski, *Monografie historyczno-genealogiczne niektórych rodzin polskich,* Warszawa 1872, t. III, s. 19

10 W. Semkowicz, dz. cyt., s. 47.

11 K. Kossakowski, dz. cyt., s. 12-13; A. Kosiński, *Przewodnik heraldyczny,* Warszawa 1880, t. II, s. 495.

З вышэйсказанага вынікае, што да Сапегаў, як да непасрэдных нашчадкаў Сунігайлы, польскі герб Ліс трапіць не мог. Уладзіслаў Сэмковіч лічыў, што ён трапіў да іх праз адопцыю на аснове прывілеі Вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча 1434 г.[12]. Згодна з ім, князям і баярам праваслаўным (праваслаўнымі спачатку былі і Сапегі) карыстацца дазвалялася „(...) гербамі ці знакамі шляхецтва, таксама як і літоўцам, але далучаюцца яны да названых знакаў праз пасрэдніцтва літоўцаў пасля атрымання згоды ад братоў па сваёй генеалогіі з Каралеўства Польскага"[13]. Але тады паўстае праблема ўласнага герба Сапегаў, якім яны карысталіся да з'яўлення ў іх Ліса. Такім гербам У. Сэмковіч лічыў Тры лiлii, дапускаючы магчымасць, што „(...) традыцыя сямейная захавала памяць гербу, які Сапегі перад прыняццем Ліса ўжывалі"[14].



Мал. 2

Рэканструкцыя

Герб Ліліі, які ўяўляў сабой у чорным полі тры белыя геральдычныя ліліі, а ў нашлемніку — палову збройнага рыцара з мячом і тарчай[15] (мал. 2), найбольш загадкавы з усіх гербаў Сапегаў. Паводле ўжо вышэйцытаванай прывілеі 1512 г., Сунігайла-Сямён герба Ліс „ (...) да даўнейшага Герба Свайго Лілiяў, праз згаданага Нарымунта Гедымінавіча князя Пінскага, Дзеда Яго, некалі прынятага, яго (герб Ліс) далучыў (...)"[16]. „Сямейная традыцыя" Сапегаў, такім чынам, звязвала герб Ліліі непасрэдна з князем Нарымунтам, што пазней, свядома ці несвядома, было пацверджана А. Міштол-

12 W. Semkowicz, dz. cyt., s. 47.

13 *Белоруссш в эпоху феодализма,* Мннск 1959, т. I, с. 121.

14 W. Semkowicz, dz. cyt., s. 48.

15 K. Kognowicki, dz. cyt., t. I, s. 16; A. Kosiński, dz. cyt., t. II, s. 493-494.

16 K. Kognowicki, dz. cyt., t. I, s. 4.

там, Б. Хмялеўскім, А. Ю. Ябланоўскім і К. Нясецкім[17]. Супраць гэтага сведчыць не толькі тое, што сама прывілея, якая паслужыла крыніцай такой „традыцыі" — падробка, але і дайшоўшы да нас сфрагістычны матэрыял. На пячатцы князя Нарымунта-Глеба Гедымінавіча (каля 1330 г.) змешчана не лілii, але агульная для ўсіх Гедымінавічаў Пагоня[18]. Няма лілій і на найстарэйшых пячатках Сапегаў як, напрыклад, на пячатцы Івашкі Сапегі (магчыма Івана Сямёнавіча), датаванай 15 індыктам (1512 г.?). На ёй відаць выяву стралы вастрыём уверх, два разы перакрыжаванай, пакладзенай на тарчы[19]. І так, у пачатку XVI ст. Ліліямі Сапегі не карысталіся і з'явіліся яны пазней, калі так званы Ліс у іх ужо быў.

А. Цітоў, разглядаючы Лілii сярод гербаў Льва Сапегі, змешчаных у *Статуце Вялікага княства Літоўскага* 1588 г., мяркуе, што дзеду Льва — Фёдару Іванавічу вялікі князь літоўскі Аляксандр надаў графскі тытул і „відаць уласны герб Тры лілii пазней названы гербам „Сапега"[20]. Але Леў Сапега паходзіў з Северскай галіны роду, якая пачыналася з вядомага нам Багдана Сямёнавіча (яго брат Іван Сямёнавіч быў заснавальнікам Кодэньскай галіны), і на самой справе дзедам яго быў Іван Багданавіч — ваявода віцебскі і падляшскі. Фёдар Іванавіч паходзіў з Кодэньскай лініі[21]. Паводле Т. Свенцкага, сын яго — Лукаш, пісаўся графам на Чарнобылю[22]. Гэта нібыта пацвярджае тое, што яго бацьку мог быць нададзены графскі тытул, а разам і герб. Праўда, не ўсе даследчыкі давалі ў бацькі Лукашу Фёдара Іванавіча. Адны лічылі яго сынам Паўла Іванавіча Сапегі з Кодэньскай лініі, які, „(...) зашлюбіўшы Сафію Кміту, дачку слаўнага ваяра Філона, атрымаў за ёю ў пасагу вялікі маёнтак Чарнобыль, на каторым пісаўся графам"[23]. Прывязка тытула да маёнтка жонкі гаворыць пра тое, што ўжо пры Кмітах існавала Чарнобыльскае графства[24]. Уступіўшы ў карыстанне ім,

17 A. A. Misztołt, *Historia illnstrissimae Domus Sapiehanae,* Wilno 1724, s. 88-91; B. Chmielowski, dz. cyt., s. 300; J. A. Jabłonowski, *Heraldyka to jest osada kleynotów rycerskich,* Lwów 1752, s. 12; K. Niesiecki, dz. cyt., t. VIII, s. 241-242.

18 А. Цітоў, *Пачаткі старажытнай Беларусі: нарысы сфрагістыкі,* Мінск 1993, с. 33; Э. Зайкоўскі, *Красамоўнасць пракаветнага,* „Мастацтва Беларусі", 1990, н-р 10, с. 72.

19 А. Цітоў, там жа, с. 58, н-р 10.

20 *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Тэксты, даведнік, каментарыі,* Мінск, 1989, с. 475.

21 W. Dworzaczek, dz. cyt., tabl. nr 171; Les Sapieha, *Etude genealogique,* Wilno 1872, s. 2-3.

22 T. Święcki, *Historyczne pamiątki znamienitych rodzin i osób dawnej Polski,* Warszawa 1859, t. II, s. 57.

23 A. Kosiński, dz. cyt., s. 512.

24 J. Walicki, *Historia Przezacnego Obrazu Kodeńskiego,* Toruń 1720, s. 61.

Лукаш Сапега пачаў ужываць графскі тытул. Другія адносілі Лукаша да Северскай ліні, лічачы яго сынам Міхала Іванавіча Сапегі, каралеўскага сакратара. Сам жа Фёдар Іванавіч ці Фрыдрых, як яго называлі, нашчадкаў не меў[25]. Праўда, А. Касіньскі згадваў, што быццам бы раззлаваны на каралеву Бону, якая адабрала ў яго нейкія ўладанні, Фёдар Іванавіч Саrtеrа „(...) перасяліўся ў Нямеччыну і аставіў там нашчадкаў, якія, з нямецкім прозвішчам, існавалі яшчэ ў прошлым [XVIII] стагоддзі[26]. Зыходзячы з таго, што ў тагачаснага імператара Святой Рымскай імперыі Карла V (1530-1556 гг.) ва ўласным гербе знаходзіліся тры ліліі[27], можна дапусціць, што ад гэтага манарха паходзяць і ліліі Сапегаў, але гэта малаверагодна. Нашлемнік герба Ліліі з выявай збройнага рыцара з мячом і тарчай, на якой змешчаны шасціканцовы крыж — нішто іншае, як дэталь герба Пагоня, што сведчыць пра дачыненне ўсяго герба да дынастыі Гедымінавічаў. Магчымыя два варыянты. Першы: герб Ліліі быў нададзены вялікім князем літоўскім Аляксандрам, прычым самая гербавая выява была падказана яго братам Фрыдэрыкам (1468-1503 гг.), які ў 1493 г. быў кардыналам і арцыбіскупам гнезненскім[28]. Гербам гнезненскай капітулы былі „(...) tria lilia alba in campo celestino portrat"[29] (мал. 3). Праўда, храналагічна Аляксандр не мог надаць герб Фёдару Іванавічу, а толькі яго бацьку — Івану Сямёнавічу. Магчыма, з гэтым быў неяк звязаны пераход Івана Сапегі ў 1492 г. у каталіцтва[30]. Герб Ліліі, дарэчы, прыпісваў Івану і яго другі сын — Павел, пра што будзе гаварыцца ніжэй.



Мал. 3

Варыянт другі, на нашу думку больш верагодны, — герб Ліліі быў прыдуманы як доказ паходжання Сапегаў ад князя Нарымунта Гедымінавіча, якому ён прыпісваўся. На гэтую думку наводзіць сведчанне Я. Валіцкага, што заснавальнік кодэньскай лініі Сапегаў — Іван Сямёнавіч быў спярша пахаваны ў Боцьках, але пазней „(...) сын Павел Сапега Ваявода Нав598градскі перанёс яго ў царкву

25 W. Dworzaczek, dz. cyt., tabl. nr 171.
26 A. Kosiński, dz. cyt., s. 511.
27 S. Górzyński, J. Kochanowski, *Herby szlachty polskiej,* Warszawa 1992, s. 9.
28 W. Dworzaczek, dz. cyt., tabl. nr 13.
29 I. Długosz, *Banderia prutenorum,* Kraków 1851, s. 46.
30 A. Kosiński, dz. cyt., s. 510.

мураваную Кодэньскую ў Замку, даўшы яму нагробак на каменнай табліцы выбіты Рускімі Літарамі Работай старасвецкай паводле яго часу, каторы потым пры пераносе цел Сапежынскіх з Царквы да Касцёла мураванага Лацінскім Стылем ёсць слова ў слова выбіты, пры Алтары велькім. Рускі ж, аб каторым вышэй згадаў, застаецца дагэтуль у Царкве над дзвярыма, маючы выбіты Пачатак і Гербы цэлага Дому ўнізе, гэта значыць тры Калюмны, Пагоня, Тры Ліліі і Ліс, а над імі дзве Мітры (...)"[31]. Узнікае пытанне: навошта патрэбныя былі гэтыя пераносы, спачатку ў царкву ў кодэньскім замку, пабудаваную тым жа Паўлам Іванавічам Сапегам, „(...) дзе таксама Гербы Ліліі і Ліс на дзвярным вушаку каменным старажытна выбітыя бачыць можна"[32], а потым — з царквы ў касцёл, прычым кідаецца ў вочы імкненне Паўла Сапегі прыдаць літарам на нагробку бацькі той кшталт, які быў для іх характэрны пры яго жыцці? На нашу думку, гэта было зроблена з мэтай стварыць доказы для радаводу, які выводзіў Сапегаў ад князя Нарымунта Гедымінавіча. Геральдычна такі радавод падмацоўваўся Мітрамі і гербамі Гедымінавічаў: Калюмнамі, Пагоняй і Ліліямі, якія прыпісваліся Нарымунту. Чаму менавіта ліліі? Хутчэй за ўсё яны былі падказаны назвай герба Ліс, бо ліс у перакладзе з французскай мовы азначае лілію[33]. Паўлу Сапегу заставала толькі на свой густ выбраць колькасць, колеры кветак і поля тарчы. У гэтым выпадку часам з'яўлення герба Ліліі ці Сапега трэба лічыць другую палову XVI ст. Адзначым галоўнае — герб Ліліі не мог быць першапачатковым уласным гербам Сапегаў. З'явіўся ён ужо пасля таго, як яны карысталіся так званым Лісам. Толькі ці быў гэта польскі герб? На нашу думку, у Ліса ператварыўся ўласны родавы знак Сапегаў у выглядзе стралы два разы перакрыжаванай з-за таго, што ён быў аўтэнтычны гербавай выяве польскага Ліса. Гэта, магчыма, падштурхнула Сапегаў да думкі вывесці свой род спачатку ад Сунігайлы, які атрымаў герб Ліс у 1413 г., а потым і ад Нарымунта, якому быў прыпісаны герб з трыма ліліямі, каторы выдаваўся за першапачатковы. Нейкім чынам, пра тое, што герб Сапегаў не быў польскім Лісам сведчыць эвалюцыя яго нашлемніка ў прадстаўнікоў як северскай, так і кодэньскай галін роду (мал. 4а, 4б, 4в). Першапачатковыя тры пёры страуса былі замененыя лісам, як у польскім гербе, а потым да яго далучылі дзве паляўнічыя трубы. Пасля таго, як у 1768 г. Сапегам Соймам Рэчы Паспалітай быў зацверджаны княжацкі тытул, замест нашлемніка ўжывалася мітра[34].

31 J. Walicki, dz. cyt., s. 79-80.

32 Там жа.

33 Н. Ф. Злотницкий, *Цветы в легендах и преданиях,* Минск 1994, с. 79.

34 A. Kosiński, dz. cyt., s. 493.



Мал. 4а



Мал. 4б



Мал. 4в



Мал. 5

Рэкансгрукцыя

З'яўленне ў Сапегаў герба, дзе ў чырвоным полі быша збройная рука, прашытая стралой, а ў нашлемніку — палова чорнага арла з мітрай на галаве і тарчай на грудзях, на якой была таксама рука[35] (мал. 5) — не вельмі яснае. Нічога не мог сказаць пра яго У. Сэмковіч[36]. А. Цітоў у сваім тлумачэнні складанага герба Льва Сапегі лічыў яго гербам бабкі Льва па маці — княжны Н. Ю. Талачынскай[37]. Нельга з гэтым пагадзіцца. У разважаннях А. Цітова адсутнічае логіка — спачатку гаворыцца, што складаны герб Л. Сапегі не адпавядае класічнаму правілу складання такіх гербаў, быццам бы з-за таго, што Леў быў трэцім сынам у сям'і[38], а потым з дапамогай гэтага правіла тлумачацца ўсе амаль гербы. Паводле прывілеі вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста ад 1572 г., Павел Іванавіч Сапега — ваявода наваградскі ездзіў з пасольствам да імператара Максімільяна II, які „(...) у нагараду яго заслуг прыдатак да Гербаў, руку збройную на полі чырвоным, Яго і Бацькі Івана Сямёнавіча некалі Віцебскага, потым Падляшскага Ваяводы нашчадкам, і цэлай фаміліі служачай, ласкава ахвяраваў, Катораму Мы таксама з-за

35 Там жа.
36 W. Semkowicz, dz. cyt., s. 48.
37 *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588...*, с. 475.
38 Там жа.



Мал. 6

Рэканструкцыя



Мал. 7

Рэканструкцыя

аказаных у Інфлянтах довадаў мужнасці, стралу прашываючую руку, у нагараду атрыманай раны, надаем, прылажылі і паміж даўнейшымі Сапежынскімі гербамі палічылі"[39]. Каспар Нясецкі, ідучы ўслед за прывілеяй, удакладняў, што Максімільян прыдаў Паўлу Сапегу збройную руку, а ў нашлемніку — чорнага арла з каронай, стралу ж дадаў Жыгімонт Аўгуст[40]. Але такое раздзяленне гербавай выявы робіць кожны з элементаў паасобку бессэнсоўным. Таму А. Касіньскі лічыў, што Паўлу Максімільян II надаў і чорнага арла ў напшемніку, і руку збройную, прабітую стралой „(...) на памяць, што ў адной з бітваў цяжка паранены быў у руку стралой(...)"[41]. К. С. Касакоўскі лічыў наогул прывілею 1572 г. падробкай, а герб — прыдуманым[42]. Разам з тым, сын Паўла Сапегі — Мікалай, маршалак гаспадарскі таксама ездзіў з пасольствам да таго ж Максімільяна II, ад якога атрымаў 6 студзеня 1572 г. тытул графа на Кодні і ордэн Залатога Руга[43]. Можна дапусціць, што яму разам з тытулам быў прыдадзены ў нашлемнік чорны імператарскі арол, як гэта звычайна рабілася. Што датычыць збройнай рукі са стралой, цалкам верагодна, што Жыгімонт Аўгуст надаў яе цалкам ці Паўлу Сапегу, ці самому Мікалаю Паўлавічу ў памяць ранення, атрыманага ў Інфлянгах, так як Яну Хадкевічу быў нададзены герб Грыф[44]. Можна сустрэць звесткі, што Мікалаю Сапегу Жыгімонт Аўгуст надаў за герб нагу, прабітую стралой[45], але гэта — памылка, бо

39 K. Kognowicki, dz. cyt., t. I, s. 10.
40 K. Niesiecki, dz. cyt., t. VIII, s. 268.
41 A. Kosiński, dz. cyt., t. II, s. 511.
42 K. S. Kossakowski, dz. cyt., t. III, s. 16.
43 Там жа, s. 89; A. Kosiński, dz. cyt., t. II, s. 512; S. Górzyński, J. Kochanowski, dz. cyt., s. 94.
44 K. S. Kossakowski, dz. cyt., t. III, s. 295. Dopełnienia i sprostowania do tomu I-XV.
45 Там жа, t. III, s. 80.

нідзе Сапегі і сам Мікалай не карысталіся такім гербам[46]. Нягледзячы на заблытанасць паходжання герба, не адмаўляецца адное — ён быў наданы Сапегам у другой палове XVI ст.

Існаванне трох вышэйадзначаных гербаў прыводзіла Сапегаў абодвух галін да жадання змясціць іх усе ў сваіх складаных гербах, як напрыклад, у гербе Льва Сапегі са *Статута Вялікага княства Літоўскага* 1588 г. (мал. 6). Гэта прыводзіла да парушэння класічных правілаў складання шматчастковых гербаў, у аснове якіх дяжаў генеалагічны прынцып[47]. Разам з тым, гэтыя правілы не адкідваліся зусім — яны заставаліся актуальнымі для гербаў па мацярынскай лініі[48].



Мал. 8
З кн: Я. Веруш-Ковальский, *Папы и папство,* Москва 1991, с. 159

З Паўлам Іванавічам Сапегам звязана з'яўленне ў гэтага роду герба Кітаўрас ці Гіпацэнтаўр (мал. 7). Каля 1525 г. ён, ажаніўшыся з Аленай Гальшанскай — прадстаўніцай славутага, але згасаючага княжацкага роду, параднёнага з Ягайлавічамі, разам з зямельнымі ўладаннямі жонкі далучыў да сваіх гербаў герб князёў Гальшанскіх — Кітаўрас[49]. У XVIII ст. герб гэты стаў адносіцца ўжо да гербаў Сапежынскага дому[50]. Тады ж у якасці Сапежынскіх гербаў пачалі выступаць Пагоня, Калюмны, Калона і герб князёў Рожынскіх. Яны былі доказамі несапраўднага паходжання Сапегаў ад Гедыміна. Пра гэта сведчылі Пагоня і Калюмны. Герб Калона з залатой каронай у белым полі быў гербам італьянскага роду Калонаў[51] (мал. 8). З гэтым родам звязваўся легендарны паплечнік Палемона Цэзарын герба Калюмна ці Калона, нашчадкам якога лічыўся Гедымін[52]. Апошні быццам бы да адной калоны з каронай „(...) тры калюмны дадаў"[53]. Пра тое, што „Гедымін замест аднаго трох слупоў ужываў", згадваў і К. Нясецкі[54]. Такім чынам, герб Калона адносіўся познімі геральдыкамі да гербаў Гедымінавічаў, таму Сапегі лічылі патрэбным выкарыстоўваць і яго. Герб князёў Рожынскіх,

46 А. Цітоў, dz. cyt. 88, н-р 188.
47 J. A. Jabłonowski, dz. cyt., s. 19.
48 *Статут Вялікага княства Літоўскага 1588...,* с. 475.
49 K. Niesiecki, dz. cyt., A. Kosiński, dz. cyt., t. II, s. 511.
50 J. Walicki, dz. cyt., s. 63.
51 *Я.* Веруш-Ковальский, *Папы и папство,* Москва 1991, с. 159.
52 K. Kognowicki, dz. cyt., t. I, s. 16.
53 Там жа.
54 K. Niesiecki, dz. cyt., t. VIII, s. 242.



Мал. 9
З кн. K. Niesiecki, *Herbarz Polski,* Lipsk 1841, s. 168



Мал. 10
Рэканструкцыя

які ўяўляў сабой у блакітным полі чатыры залатыя крыжы, што вісяць па два на „дрэве"[55] (мал. 9), выкарыстоўваўся з той прычыны, што Сапегі лічылі Рожынскіх сваімі сваякамі, бо тыя таксама выводзілі сябе ад Нарымунта Гедымінавіча[56]. Разам з сапраўднымі гербамі Сапегаў гэтыя гербы, па сутнасці, самавольна далучаныя, склалі васьмічастковы герб Сапегаў, які мы падаем паводле А. Міштолта (мал. 10).

Падсумоўваючы сказанае адзначым, што першапачатковым уласным гербам Сапегаў быў герб, які выйшаў з так званага знака ўласнасці ці кляйма ў выглядзе два разы перакрыжаванай стралы. З-за свайго падабенства ў другой палове XVI ст. ён стаў атаясамлівацца з польскім Лісам, што аблегчыла Сапегам стварэнне радаводу ад літоўскага баярына Сунігайлы, які атрымаў Ліса ў Гарадле ў 1413 г. Разам з тым, на яго месца ўводзіўся герб Ліліі, прыпісаны князю Нарымунту. З наданнем герба з выявай рукі са стралой стала існаваць група гербаў, якія ўжо ў XVI ст. лічыліся ўласна Сапежынскімі. Існаванне трох гербаў прыводзіла да жадання ў прадстаўнікоў роду змясціць іх усе на сваіх складаных гербах. Пры гэтым Сапегі карысталіся, па сутнасці, змешаным правілам складання шматчастковага герба, дзе генеалагічны прынцып выкарыстоўваўся пры змяшчэнні гербаў па „кудзелі", ці па мацярынскай лініі. Гербы Сапегаў былі не толькі сведчаннем іх шляхецкага паходжання, іх заслуг перад Айчынай, але ў першую чаргу яны з'яўляліся асноўнымі доказамі несапраўднага радаводу сваіх уладальнікаў ад вялікага князя Гедыміна. Асабліва гэта датычыць Ліліяў і гербаў далучаных у XVIII ст. Вынікам было зацвярджэнне Сапегам Соймам Рэчы Паспалітай у 1768 г. княжацкага тытула.

55 Там жа, t. VIII, s. 167.
56 Там жа, t. VIII, s. 168.

**Streszczenie**

Wśród herbów wykorzystywanych przez ród Sapiehów w XVI - XVIII w. najczęściej występowały: polski herb Lis, herb Trzy Lilie oraz herb z rysunkiem przebitej strzałą ręki uzbrojonej w miecz. Autor artykułu postawił sobie za cel wyjaśnienie, jaki był pierwotny herb Sapiehów oraz co zadecydowało o ostatecznym ukształtowaniu się herbu Sapiehów.

Zdaniem autora, pierwotnym herbem Sapiehów była dwukrotnie skrzyżowana strzała. Z powodu podobieństwa w II poł. XVI w. zaczęto go utożsamiać z polskim Lisem, co ułatwiło Sapiehom zbudowanie genealogii od litewskiego szlachcica Sunigajły, któremu nadano Lisa w Horodle w 1413 r. Równolegle na pieczęciach Sapiehów zaczął się pojawiać herb Trzy Lilie, który przypisuje się księciu Narymuntowi. Od momentu nadania herbu z uzbrojoną ręką przebitą strzałą zaczęła funkcjonować grupa herbów, które już w XVI w. uważano za należące do Sapiehów.

Herby Sapiehów nie tylko świadczyły o ich szlacheckim pochodzeniu i zasługach w służbie ojczyźnie. Ich najważniejszym atutem było to, że udowadniały pochodzenie właścicieli od księcia Gedymina. Dzięki temu w 1768 r. było możliwe przyznanie przez Sejm Rzeczypospolitej Sapiehom tytułu książęcego.

**Summary**

Among the armorial bearings used by the Sapieha family in the 16th-18th centuries, the Polish „Lis" [Fox], the Three Lilies, and a blazon with the charge of a hand brandishing a sword and pierced by an arrow were most often. The author explains from where the original coat of arms of the Sapieha family came and how it evolved to its final form.

According to the author, the Sapiehas' original coat of arms bore the charge of a twice crossed arrow. In the second half of the 16th century, this blazon, due to its similarity to the Polish „Lis", began to be identified with the latter. This helped the Sapiehas derive their genealogy from a Lithuanian nobleman, Sunigajło, who was granted the „Lis" in Horodło in 1413. Simultaneously, the Sapiehas began using seals with the Three Lilies charge, which was attributed to Prince Narymunt. After the Sapiehas were granted the coat of arms with a hand brandishing a sword and pierced by an arrow, a group of armorial bearings appeared in the 16th century, which can be attributed solely to this family.

The Sapiehas' armorial bearings bore witness not only of the family's noble descent and services rendered to the country. They also proved the family's descent from Prince Gedymin. Due to this, it became possible for the Polish-Lithuanian Sejm in 1768 to grant the Sapiehas the title of Prince.